Падтрымай "Вясну" на PATREON

Глыбокае: Фрылансер-журналіст у чацвёрты раз у гэтым годзе пакараны штрафам

23.04.2018 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода слова



Зміцер Лупач.

Глыбоцкі раённы суд прысудзіў 35 базавых велічынь штрафу незалежнаму журналісту **Змітру Лупачу**. Па інфармацыі службы маніторынгу ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў", судовае слуханне праходзіла 20 красавіка — у дзень, калі ў Мінску адбываўся з'езд ГА "БАЖ", на які Зміцер Лупач павінен быў ехаць. Таму суд адбыўся без Змітра, працэс вёў суддзя Глыбоцкага райсуда **Андрэй Тарасевіч**. На ім прысутнічалі толькі жонка Змітра і яго калега, рэдактар газеты "Вольнае Глыбокае" **Уладзімір Скрабатун.**

Нягледзячы на тое, што капітан міліцыі **Сяргей Цырбан**, які складаў пратаколы на Змітра, казаў, што будуць два суды па двух справах, адбыўся адзін суд, і справы аб'ядналі. Падчас працэсу заслухалі толькі аднаго сведку Валерыя Катовіча, які ўзгадваўся ў другім пратаколе. Справа датычылася сюжэта на спадарожнікавым тэлеканале "Белсат" пад назвай "Ваўкі тэрарызуюць Віцебшчыну. Страх апанаваў людзей". Па першай справе, якая была распачатая за сюжэт "150 – добры заробак. Маленькім гарадам – канец?" сведкаў у судзе не было. Перад судом участковы міліцыянт наведаў людзей, узяў у іх распіскі і паведаміў, што яны могуць не ехаць у суд.

Сёлета журналіста-фрылансера Змітра Лупача судзілі чацвёрты раз па частцы 2 артыкула 22.9 КаАП. За супрацу з тэлеканалам "Белсат" яго ўжо штрафавалі Пастаўскі, Докшыцкі і Шаркоўшчынскі суды на 25, 40 і 23 базавых велічынь адпаведна.

Ад пачатку года адбылося каля 30 судоў над незалежнымі журналістамі, якія супрацоўнічаюць з тэлеканалам "Белсат".

Твитнуть





зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"




#ВолюВясне


ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брасце і Віцебску пасля рэйда па сацсетках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY